


Мал. 97. Міжнародная міграцыя насельніцтва Беларусі, чал.

**Абагульнім і запомнім.** Беларусь адносіцца да краін са складанай дэмаграфічнай сітуацыяй. Для насельніцтва Беларусі характэрна перавышэнне долі насельніцтва ва ўзросце, старэйшым за працаздольны, над дзіцячым насельніцтвам. У насельніцтве краіны пераважаюць жанчыны. У Беларусі назіраецца рост унутранай міграцыі і дадатнае сальда знешняй міграцыі.

1. Назавіце прычыны дэпапуляцыі насельніцтва ў Беларусі. 2. У чым заключаюцца асаблівасці ўзроставай структуры насельніцтва Беларусі? 3. Якую інфармацыю можна атрымаць, аналізуючы полаўзроставую піраміду? 4. Якія віды міграцыі характэрныя для Беларусі?

5. Чаму ў Мінску самы нізкі паказчык смяротнасці? 6. Якімі фактарамі можна растлумачыць перавагу жанчын у агульнай колькасці насельніцтва краіны? 7. Якія змены адбыліся ў напрамках міграцыйных патокаў у пачатку XXI ст.? 8. Да якіх дэмаграфічных наступстваў можа прывесці міграцыя з сельскай мясцовасці ў горад?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Выкарыстоўваючы даныя малюнка 97, разлічыце сальда міграцыі.

# § 24. Працоўныя рэсурсы. Этнічны і рэлігійны склад насельніцтва

***Узгадваем.*** *Чаму самай важнай часткай насельніцтва з'яўляюцца працоўныя рэсурсы? Што такое этнас? Назавіце сусветныя рэлігіі.*

**Працоўныя рэсурсы.** Для эканамічнага развіцця краіны важнейшую ролю адыгрывае насельніцтва працаздольнага ўзросту, якое адносіцца

да працоўных рэсурсаў. У Беларусі працаздольны ўзрост для жанчын — ад 15 да 54 гадоў, для мужчын — ад 15 да 59 гадоў, а ў цяперашні час ён павялічваецца на тры гады. Аднак шахцёры, металургі, вайскоўцы, балярыны і прадстаўнікі іншых прафесій з цяжкімі ўмовамі працы маюць права на датэрміновы выхад на пенсію. Акрамя іх, ёсць людзі, якія не могуць працаваць па стане здароўя. Таму да працоўных рэсурсаў адносяцца не ўсе асобы працаздольнага ўзросту. Беларусь валодае значнымі па колькасці і высокімі па якасці працоўнымі рэсурсамі, якія ўключаюць 60,5 % усяго насельніцтва краіны. Асноўную частку складае працаздольнае насельніцтва ў працаздольным узросце (93,4 %). Акрамя таго, да працоўных рэсурсаў адносяцца працуючыя асобы, старэйшыя і маладзейшыя за працаздольны ўзрост.




Мал. 98. Графік змены колькасці працоўных рэсурсаў Беларусі, тыс. чал.

Агульная сярэднегадавая колькасць працоўных рэсурсаў краіны ў 2017 г. склала 5744,4 тыс. чалавек. З 2008 г. з'явілася і набыла ўстойлівы характар тэндэнцыя скарачэння гэтага паказчыка (мал. 98). *Чаму ў Беларусі адбываецца скарачэнне колькасці працоўных рэсурсаў?* У большасці рэгіёнаў скарачэнне колькасці працоўных рэсурсаў пачалося яшчэ ў пачатку 2000-х гг. Выключэнне складае толькі г. Мінск, дзе дадатная дынаміка колькасці працоўных рэсурсаў захоўвалася да 2011 г.

Для паспяховага сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны важнае значэнне мае якасны склад працоўных рэсурсаў. Ён вызначаецца прафесійным складам, узроўнем адукацыі і кваліфікацыі, сярэднім узростам. Высокі адукацыйны ўзровень працоўных рэсурсаў з'яўляецца базавай умовай інавацыйнага развіцця. У перспектыве попыт на кваліфікаваныя рэсурсы будзе расці. Так, паводле ацэнак, да 2025 г. доля высокакваліфікаваных працаўнікоў у структуры працоўнай сілы будзе складаць 39 %.

Па перапісе 1989 г. 77 % жыхароў Беларусі ва ўзросце 15 гадоў і старэй мелі вышэйшую або сярэднюю адукацыю, у 1999 г. — 85 %, а ў 2009 г. — 90 %. За перыяд 1991–2017 гг. у 5 разоў вырасла колькасць насельніцтва, якое валодае замежнымі мовамі. Пра што кажуць дадзеныя факты?

**Эканамічна актыўнае насельніцтва. Праблемы занятасці працоўных рэсурсаў.** Асноўная частка працоўных рэсурсаў занята ў сферы

матэрыяльнай вытворчасці або ў сферы паслуг. Яны адносяцца да **эканамічна актыўнага насельніцтва**.

**Эканамічна актыўнае насельніцтва** — насельніцтва працаздольнага ўзросту, у якога ёсць магчымасць удзельнічаць у працэсе вытворчасці матэрыяльных каштоўнасцей, а таксама ў прадастаўленні неабходных паслуг.

Міжнародная арганізацыя працы ў гэтую катэгорыю ўключае людзей ва ўзросце ад 15 да 72 гадоў. Эканамічна актыўнае насельніцтва можна падзяліць на занятых і беспрацоўных. Асаблівасцю гэтага паказчыка з'яўляецца тое, што ён залежыць ад самавызначэння чалавека. Так, некаторыя групы грамадзян могуць быць аднесены да эканамічна актыўнага насельніцтва толькі часткова. Напрыклад, студэнты ўстаноў вышэйшай адукацыі ці пенсіянеры могуць адносіцца да дадзенай катэгорыі пры частковай занятасці, а могуць і не адносіцца.

Нераўнамерна размеркавана занятае насельніцтва па адміністрацыйных раёнах. Найбольшая яго колькасць назіраецца ў Мінскім і Барысаўскім раёнах, дзе гэты паказчык перавышае 80 тыс. чалавек. Высокая занятасць у Мазырскім, Маладзечанскім, Салігорскім, Лідскім, Жлобінскім раёнах. Якія фактары ўплываюць на нераўнамернае размеркаванне? Чаму менавіта ў гэтых раёнах вялікая колькасць занятага насельніцтва?

Структура занятага насельніцтва па галінах і відах эканамічнай дзейнасці падобная па абласцях і краіне ў цэлым (мал. 99). У прамысловасці ў сярэднім занята 23 %, у будаўніцтве, адукацыі, ахове здароўя, сельскай гаспадарцы — 7–10 %. Значная розніца паказчыкаў характэрная для гандлю. Калі ў абласцях у гандлі занята 12 %, то ў Мінску паказчык дасягае 19 %. Гэта тлумачыцца вялікімі даходамі і спажываннем у сталіцы.

Аднак не ўсе жыхары Беларусі могуць знайсці працу ў адпаведнасці са спецыяльнасцю. У краіне ўзнікае такая з'ява, як *беспрацоўе*, калі частка эканамічна актыўнага насельніцтва не можа працаўладкавацца па спецыяльнасці ў сілу розных прычын. У Беларусі яна мае невялікія памеры. У краіне дзейнічае дзяржаўная служба занятасці насельніцтва, якая вядзе ўлік свабодных працоўных месцаў, рэгістрацыю беспрацоўных, ажыццяўляе працаўладкаванне і перападрыхтоўку кадраў, выплату дапамог па часовым беспрацоўі.

Узровень зарэгістраванага беспрацоўя ў 2017 г. склаў 0,8 % ад эканамічна актыўнага насельніцтва Беларусі. Ён не мае значных




Мал. 99. Структура занятасці насельніцтва Беларусі па відах эканамічнай дзейнасці, %

тэрытарыяльных адрозненняў. Узровень афіцыйна рэгіструемага беспрацоўя на працягу апошніх 10 гадоў зніжаецца. Праблемай занятасці насельніцтва з'яўляецца скрытае беспрацоўе. Частка працаздольнага насельніцтва толькі часткова забяспечана працоўнымі месцамі. Частковая занятасць дапускае магчымасць працаваць сезонна ці не поўны працоўны дзень.

**Этнічны склад насельніцтва.** Размяшчэнне Беларусі ў цэнтры Еўропы абумовіла пражыванне на яе тэрыторыі розных народаў. Гэта спрыяла фарміраванню асаблівага этнакультурнага асяроддзя, заснаванага на верацярпімасці, павазе да звычаяў і нораваў іншых народаў. На фарміраванне беларускай культуры, якая адносіцца да агульнаславянскага тыпу, вялікі ўплыў аказала хрысціянства. У Беларусі жывуць прадстаўнікі больш чым 130 нацый і народнасцей (мал. 100). Беларусы складаюць аснову насельніцтва — 83,7 %. Найбольшая доля беларусаў у Мінскай вобласці, найменшая — у Гродзенскай. Большасць з іх роднай лічаць беларускую мову, аднак у краіне даволі шмат мясцовых дыялектаў. *Чаму на тэрыторыі Беларусі шмат мясцовых дыялектаў?*




Мал. 100. Нацыянальны склад насельніцтва Беларусі, % (па перапісе 2009 г.)

Растлумачце тэрытарыяльныя адрозненні ў размеркаванні асноўных этнасаў (с. 32 атласа).

Другім па колькасці этнасам у Беларусі з'яўляюцца рускія, доля якіх складае 8,3 %. Рускія пражываюць пераважна ў буйных гарадах з прамысловымі прадпрыемствамі, якія вызначаюць спецыялізацыю Беларусі ў гаспадарчым комплексе СССР. У Віцебскай вобласці і г. Мінску доля рускіх складае больш за 10 % насельніцтва. Уздоўж беларуска-літоўскай мяжы кампактнай групай жывуць палякі, якія займаюць трэцяе месца ў краіне. У Гродзенскай вобласці доля палякаў перавышае 20 %, а ў Воранаўскім раёне — нават 80 %. На паўднёвым захадзе краіны і ўздоўж украінска-беларускай мяжы пражываюць украінцы, доля якіх, як правіла, не перавышае 5 % ад насельніцтва раёна. Яўрэі гістарычна пражываюць у асноўным у гарадах. У некаторых раёнах Гродзенскай вобласці сустракаюцца кампактныя групы з літоўскім насельніцтвам. На ўсходзе Беларусі з даўніх часоў пражывалі латышы, колькасць якіх у апошнія гады значна скарацілася з-за эміграцыі. За першыя дзесяцігоддзі XXI ст. значна вырасла колькасць армян, кітайцаў, туркменаў, якія пастаянна пражываюць у Беларусі.

У наваколлі буйных гарадоў сустракаюцца паселішчы цыган (в. Калодзішчы каля Мінска, Цітаўка на ўскраіне Бабруйска і інш.). У асобных раёнах Мінскай і Гродзенскай абласцей утварыліся гістарычныя арэалы пражывання татараў. Чаму на тэрыторыі Беларусі сфарміраваліся цыганскія і татарскія паселішчы?

**Рэлігійны склад насельніцтва.** Наяўнасць розных этнасаў і гісторыя фарміравання краіны абумовілі поліканфесійную структуру грамадства. На тэрыторыі Беларусі 25 рэлігійных канфесій. Па колькасці вернікаў асноўнымі з'яўляюцца праваслаўнае і рымска-каталіцкае хрысціянства. Канкурэнцыю ім па колькасці рэлігійных суполак ствараюць пратэстанты. У многіх раёнах цэнтральнай часткі Палесся колькасць пратэстанцкіх суполак істотна перавышае колькасць рымска-каталіцкіх, а ў некаторых раёнах і праваслаўных.

Знайдзіце раёны, у якіх доля праваслаўных абшчын саступае іншым канфесіям (с. 33 атласа).

З 90-х гг. мінулага стагоддзя ўсе канфесіі краіны актывізавалі рэлігійную і дабрачынную дзейнасць. Пачалі аднаўляцца цэрквы і касцёлы, праваслаўныя манастыры. У цяперашні час у Беларусі дзейнічае больш за 3500 рэлігійных суполак, больш за 40 манастыроў, больш за 10 храмаў,

вядомых далёка за межамі краіны. У Мядзельскім раёне ў аг. Будслаў штогод тысячы чалавек з розных краін удзельнічаюць ва ўрачыстасцях у гонар абраза Будслаўскай Божай Маці на тэрыторыі рымска-каталіцкай парафіі Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі (мал. 101). У 2018 г. ЮНЕСКА ўключыла фестываль у Будславе ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Большасць рымска-каталіцкіх рэлігійных устаноў знаходзіцца ў Гродзенскай вобласці.



Мал. 101. Касцёл у аг. Будслаў

Праваслаўная царква падзяляецца на 15 епархій, рымска-каталіцкая — на 4 дыяцэзіі. Акрамя таго, у Беларусі каля 900 пратэстанцкіх суполак, 27 — лютэранскіх, 52 — іўдзейскія і 24 — мусульманскія. У рэспубліцы функцыянуе каля 20 духоўных навучальных устаноў розных канфесій.

**Абагульнім і запомнім.** Доля працаздольнага насельніцтва ў працоўных рэсурсах складае 93,4 %. Крыху больш за 80 % ад колькасці жыхароў працаздольнага ўзросту Беларусі адносіцца да эканамічна актыўнага насельніцтва. Беларусы складаюць асноўную частку насельніцтва ў этнічнай структуры. Асноўныя канфесіі — праваслаўнае і рымска-каталіцкае хрысціянства.

1. Чаму колькасць працоўных рэсурсаў меншая за колькасць асоб працаздольнага ўзросту? 2. Якое насельніцтва адносіцца да эканамічна актыўнага? 3. Што такое беспрацоўе? 4. Якія этнасы пераважаюць у структуры нацыянальнага складу насельніцтва Беларусі?

5. Чым тлумачацца малыя адрозненні структуры занятага насельніцтва па відах эканамічнай дзейнасці? 6. Як дзелавыя якасці чалавека могуць гарантаваць канкурэнтаздольнасць на рынку працы? Якія геаграфічныя веды пры гэтым будуць неабходныя? 7. Чаму размеркаванне нацыянальнасцей на тэрыторыі Беларусі мае пераважна гістарычны характар?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Распрацуйце рэкламны плакат «Кірмаш вакансій» вашага раёна.